# Сакральны помнік даўніны

***На самым высокім пагорку аграгарадка Вішнева, што ў Смаргонскім раёне, велічна ўзнімаецца светлы мураваны храм падобны на віленскую катэдру. Гэта касцёл святога апостала Юды Тадэвуша. Закладзены ён, як сведчыць надпіс на падмурку, у 1811 годзе. Будаваўся храм на сродкі прадстаўнікоў шляхецкага роду Сулістроўскіх герба “Любіч”. Сёлета касцёл адзначыць сваё 200-годдзе. Да гэтай даты Гродзенскай дыяцэзіяй выдадзена мастацка-дакументальная аповесць Анатоля Шчучко “Святыні маўклівыя цені”, у якой распавядаецца гісторыя вішнеўскага касцёла. Але гэты матэрыял не пра храм. У трох кіламетрах ад Вішнева знаходзіцца ўнікальная капліца, якая старэй за юбіляра яшчэ гадоў на 50.***

Ці задумваліся вы калі-небудзь аб тым, што рознага кшталту містычныя падзеі здараюцца найчасцей у месцах занядбаных, пазбаўленых людской увагі, дзіцячых галасоў, малітваў вернікаў? Колькі ўжо дзесяцігоддзяў запар нават выпадковы пілігрым не пераўжагнаўся ля старажытнай капліцы святога Яна Хрысціцеля, што знаходзіцца ў Смаргонскім раёне пры дарозе з Вішнева на Свір. Стаіць яна абяскрыжаная, разбураемая вятрамі і залевамі, зімовымі маразамі і летняй спёкай, у атуленні ялін і кустоўя вярбы. Пра гэта месца мясцовыя жыхары ведаюць шмат жудасных гісторый. Нават людзі далёка не прымхлівыя гатовы паверыць у яго анамальнасць.

Напрыканцы мінулага года тут адшукалі старадаўні каваны крыж. Гэты крыж памерам 135 на 95 см некалі мацаваўся да шарападобнай драўлянай “макаўкі” культавага збудавання, што па сведчанні знаўцаў налічвае 250 гадоў. Па тым як добра захавалася знаходка, можна меркаваць, што гэты сімвал ахвярнай Божай любові не проста зваліўся, а быў беражліва закапаны вернікам, схаваўшым яго ад ваяўнічых атэістаў.



Добрым знакам лічыць знаходку крыжа пробашч Вішнеўскай парафіі святога Юды Тадэвуша Антоній Казлоўскі. На тэрыторыі гэтай парафіі і стаіць каплічка.

Пра гісторыю капліцы мы пагутарылі з краязнаўцам-энтузіястам, настаўніцай гісторыі Вішнеўскай сярэдняй школы Нэлі Тумаш. Міжволі падумалася, што нейкія незямныя сілы нагадваюць пра сябе, калі Нэлі Імпалітаўна пераказала ўсе трагічныя выпадкі, якія стварылі нядобрую славу месцу каля лясной сцежкі на Краснаазёрнае (колішняй Галоднічы). Недзе тут замерз марознай ноччу юнак, што збіўся з дарогі і заблудзіў літаральна ў трох хвоях. Тут жа забілі нейкія

вар'яты цяжарную жанчыну. На самой шашы, у гэтым месцы прамой як страла, без аніякіх абмежаванняў для бачання, час ад часу здараюцца аўтамабільныя аварыі, а не так даўно пасярод белага дня пад коламі машыны загінула веласіпедыстка.




Некалі стромкая, маляўнічашыкоўная, збудаваная з чырвонай цэглы ў познебарочным стылі з элементамі ракако, каплічка святога Яна, цяпер мае варты жалю выгляд. Некалькі гадоў таму яна наогул патанала ў лясным зарасніку. Тагачасны святар ксёндз Віктар Субуль са сваімі памочнікамі заняўся расчысткай прыкаплічнай тэрыторыі. Яго справу прадоўжыў стрыечны брат Нэлі Тумаш – бізнесовец з Бранска Аляксандар Дзівоніс. Гэта яго стараннямі быў створаны праект рэстаўрацыі, устаноўлены інфармацыйныя шчыты, праведзена кансервацыя аб'екта. Але далей справа чамусьці не пайшла. Ці фінансаў не хапіла, ці нейкая іншая прычына.

Пакуль не ўдалося дакладна вызначыць дакладны час пабудовы капліцы. Вядома толькі што падобныя па стылю мініяцюрныя сакральныя аб'екты паўсталі ў нашым рэгіёне прыкладна ў адзін перыяд  напрыканцы 18 – пачатку 19 стагоддзяў каля палаца-паркавых комплексаў Гюнтараў у Дабраўлянах, Агінскіх у Ганупе-Ручыцы, і каля Вішнева. Смаргонскія краязнаўцы Уладзімір Прыхач і Алег Мізула мяркуюць, што ўсе яны будаваліся па праекце аднаго архітэктара – прафесара архітэктуры, матэматыкі і астраноміі Віленскага ўніверсітэта Тадэвуша Жаброўскага. Звесткі аб дабраўлянскай капліцы ўтрымліваюцца ў працы вядомага даследчыка старадаўніх сядзіб Рамана Афтаназі, дзе ён згадвае аб тым, што мясцовыя ўладальнікі "паклапаціліся аб тым, каб па-за паркам паўстала тыповая белая, мураваная капліцка на фоне цёмна- зялёнага лесу, характэрная для віленскага пейзажу". Дасканалыя прапорцыі, завершаная шлемападобным купалам цэнтрычная вежа надавалі гэтым помнікам паветраную лёгкасць і архітэктурна-мастацкую выразнасць. Вежа мела на гранёным пастаменце драўляную скульптуру Божай Маці.

Калі ж наогул, пачалі з'яўляцца мураваныя прыдарожныя капліцы ў нашым рэгіёне, дакладна вызначыць па часе немагчыма, бо народная культура мінулага, ў тым ліку гісторыя будаўніцтва гэтых мініяцюрных сакральных аб'ектаў, засталася па-за ўвагай пісьмовых крыніц. Многія з іх зніклі пад навалай ліхалеццяў, войнаў, бездухоўнасці. Тыя што засталіся варты быць захаванымі. Так лічаць мясцовыя жыхары, многія з якіх унеслі фінансавыя сродкі на аднаўленне. Але пакуль капліца стаіць шчыльна атуленая з усіх бакоў рыштаваннямі, якія могуць і не ўратаваць яе ад абвалу.



Хтосьці пакінуў тут дзве іконы: Маці Божай Вострабрамскай і Дзевы Марыі з Езусам. Ці абароняць яны святыню ад разбурэння, а людзей ад чарговых трагедый у яе ваколіцах?

**Ала СТРАШЫНСКАЯ.**
**Фота аўтара.**
**На здымку:**

- **Знойдзены крыж трымае пробашч Вішнеўскай парафіі святога Юды Тадэвуша Антоній Казлоўскі.**
- **Старажытная капліца Яна Хрысціцеля.**